# НАШ Магілёў

Сьнежань, 2007 год
Незалежнае грамадзка - палітычнае выданьне Горада

23

www.nmahileu.org



З Новым Годам і Калядамі!

Рэдакцыя газэты “НАШ Магілёў” шчыра віньшуе магілёўцаў і гасьцей гораду з надыходзячым Новым годам! Жадае Вам моцнага здароўя, добрага настрою, эканамічнага дабрабыту й посьпеху ва ўсіх справах! Няхай гэты год прынясецьВам усё толькі радаснае, а ўсё дрэннае застанецца ў годзе мінулым!

# Вынікі году

## Ад рэдакцыі

**Пра нас…**

Так сталася, што напрыканцы году кожны праводзіць для сябе аналіз таго, чаго ён дасягнуў за год мінулы, якія былі перамогі і якія былі паразы.

У гэтым годзе ў Магілёве была створана творчая група “НАШ Магілёў”, намаганьнямі якой выпускаецца незалежная газэта “НАШ Магілёў”, працуе сайт газэты www.nmahileu.org, выходзяць бюлетэні “Голас Ліфтмаша”, “БУМ”, аказваецца дапамога ў выданьні “Сацыяльнай газэты” і дадатка да газэты прафсаюза РЭП “СМС”.

Зараз вы трымаеце ў руках 23 нумар нашай газэты. Гэта ўжо нейкае, хай сабе й невялічкае дасягненьне, бо на працягу апошніх больш пяці год Магілёў ня меў незалежнай пэрыядычнай прэсы. Мы й у новым годзе будзем радаваць вас сваімі навінамі! Чытайце нас і заходзьце на наш сайт!

**У горадзе…**

Бадай самай вялікай падзеяй у Магілёве ў зыходзячым годзе сталася адбудова Ратушы. Нарэшце магілёўцы дачакаліся гістарычнага рашэньня гарвыканкаму аб пачатку будоўлі гэтага гістарычнага аб’екту, і калі меркаваць па зададзеных тэмпах, то гэты аб’ект можа быць здадзены да наступнага юбілею горада.

У гэтым годзе стаханаўскімі тэмпамі быў пабудаваны мост, які зьвязаў плошчу Арджанікідзэ з вуліцай Лазарэнкі, значна разгрузіў пры гэтым транспартныя патокі.

20 лістпада суд Кастрычніцкага раёна г. Магілёва спрачыніўся да “палітычнай справы” і вынес прысуд актывісту незарэгістраванай арганізацыі “Малады Фронт” Артуру Фінькевічу ў выглядзе 1,5 год пазбаўленьня волі з адбываньнем пакараньня ў калёніі агульнага рэжыму. Дагэтуль Артур адбываў пакараньне ў выглядзе двух гадоў “хіміі” за графіці, зробленае падчас выбарчай кампаніі 2006 года.

У гэтым годзе ў горадзе нарадзіўся 370-тысячны жыхар, што сьведчыць аб тым, што за годы незалежнасьці горад недалічыўся амаль два дзесяткі тысячаў чалавек.

Жыцьцё горада разбаўлялі частыя затрыманьні грамадзкіх актывістаў, то за пратэсты супраць адмены ільготаў, то за раздачу незалежных выданьняў на вуліцах гораду, то за актыўнасьць падчас выбарчай кампаніі ў дэпутаты мясцовых Саветаў дэпутатаў, якая скончылася напачатку гэтага гораду. Горад у выніку атрымаў аднаго дэпутата дэмакратычных поглядаў. Свой мандат у чарговы раз пацьвердзіў выкладчык унівэрсытэту імя А.Куляшова Аляксандар Агееў.

У Магілёве ўпершыню за некалькі апошніх год у дзіцячым садку пачала сваю працу першая беларускамоўна група. Група зьявілася па ініцыятыве бацькоў, якія захацелі, каб іхнія дзеці выхоўваліся ў атачэньні беларушчыны й любові да сваёй мовы й культуры. Рэдакцыя газэты спадзяецца, што ў наступным годзе такіх групаў будзе больш і, нарэшце, зьявяцца беларускамоўныя клясы, якіх зараз у Магілёве няма.

**У краіне…**

10 сьнежня адбылася важкая падзея ў жыцьці незалежнай прэсы – пачаў працу незалежны беларускамоўны спутнікавы тэлеканал “БелСат”, які вядзець сваю трансьляцыю з Польшчы й ставіць за мэту прарваць інфармацыйную блякаду, ў якой апынулася Беларусь, дзякуючы дзяржаўнай палітыкі ўлады.

Гэты год запомніўся нам дынамічна паўзучым ростам коштаў на прадукты харчаваньня й камунальныя паслугі. Цэны ў крамах мяняліся штомесяц, а заробкі, як гэта сталася традыцыяй, не пасьпявалі за імі.

У гэтым годзе была падпісана дамова з Расеяй аб пастаўках газу па коштах 119 даляраў за першы квартал 2008 года.

Беларусь з пагардай паглядзела на 12 прапановаў Эўразьвязу й не толькі не выпусьціла палітвязьняў, а некаторым зь іх дала новыя тэрміны зьняволеньня.



Будаўніцтва Магілёўскай Ратушы. Стан на 26. 12. 2007

У гэтым годзе прайшлі Эўрапейскі й Сацыяльны маршы, якія сабралі пад сваімі сьцягамі каля 7 і 5 тысячаў чалавек, прыхільнікаў хутчэйшага далучэньня Беларусі да Эўрапейскай сям’і й праціўнікаў адмены ільготаў.

У гэтым годзе былі адменены ільготы на праезд студэнтам, шкалярам, пэнсіянэрам і іншым сацыяльна неабароненым слаям насельніцтва. Цяжкі ўдар быў нанесены малому й сярэдняму бізнэсу. Прадпрымальнікаў прымусілі прайсьці перарэгістрацыю й стварыць прыватныя ўнітарныя прадпрыемствы. Толькі невялікая частка прайшла перарэгістрацыю й згадзілася з новым законапраэктам. Астатнія дагэтуль ужо правялі папераджальны страйк і пагражаюць зачыніць свае гандлёвыя кропкі на месяц, калі не будзе ўдасканалены гэты закон. У адмоўным выпадку частка прадпрымальнікаў будзе пераношаць свой бізнэс у суседнія краіны, у тым ліку Расею, што вельмі моцна адаб’ецца на атрыманьні падаткаў дзяржавай і простых яе грамадзянах.

Беларусь пацьвердзіла свой высокі статус на дзіцячым конкурсе “Эўрабачаньне” і ў чарговы раз заняла першае месца. На гэты раз перамогу сьвяткаваў Аляксей Жыгалковіч.

З новага года беларусы сутыкнуцца з новымі коштамі на візы, пры жаданьні выехаць у краіны Эўразьвязу. Новы кошт візам -60 Эўра. Некаторыя краіны будуць уводзіць для беларусаў нацыянальныя візы коштам 35 Эўра.

З новага года будзе адменены “штамп” на выезд за мяжу. У выніку гэтага грамадзяне атрымаюць эканомію грашовых сродкаў у памеры адной базавай велічыні на год.

У гэтым годзе Беларусь здолела адстаяць сваю незалежнасьць у палітычным пляне, спадзяемся, што цяперашняя ўлада зробіць усё каб яе не згубіць і ў наступным годзе. У зыходзячым годзе пачалася паступовая прыватызацыя прадпрыемстваў. Пачаўся ціхі распродаж дзяржаўнай маёмасьці й кантрольных пакетаў акцыяў некаторых прадпрыемстваў.

Прэзыдэнт у гэтым годзе нічым неардынарным нас не зьдзівіў і не пацешыў, хіба пара ўжо яму на пэнсію…

## Інтерфакс

# В новогоднюю ночь в Беларуси будет не ниже 5 градусов мороза

**Погоду в Беларуси в последние дни уходящего года будет формировать южная часть атлантического циклона, сообщили "Интерфаксу" в среду в Республиканском гидрометеоцентре.**

"Южная периферия атлантического антициклона обусловит погодные условия в Беларуси в последние дни уходящего года", - сообщили в центре. "30 декабря в целом по республике в дневные часы ожидается от минус 4 до плюс 2 градусов, ночью 1 - 7 градусов мороза",- сообщили синоптики. 31 декабря местами по территории, ожидается небольшой снег, мокрый снег. Местами туман, слабый гололед, на дорогах гололедица, ветер южный 4 - 9 метров в секунду, температура воздуха 0 - минус 5 градусов, проинформировали в центре.

В предстоящие трое суток территория Беларуси останется под влиянием довольно влажной воздушной массы, ожидается облачная погода, сообщили синоптики. 27 декабря в отдельных районах ожидается небольшой снег, 28 - 29 декабря небольшой мокрый снег пройдет преимущественно в северных районах, местами туман, слабые гололед, изморозь, на отдельных участках дорог гололедица, рассказали синоптики. Температура воздуха ночью 3-9 градусов мороза, днем - минус 1 - 7, уточнили в центре.

Магілёўскія дэмакраты



Аляксей Паўлоўскі, грамадзкі й прафсаюзны актывісты

# Ціснуць толькі на тых, у каго нявызначаная, хісткая пазыцыя

**Чаму я ў апазыцыі?**

Да ўлады я быў заўсёды ў апазыцыі. Гэта ў мяне пачалося яшчэ з камуністычных часоў, бо я бачыў, што яна трымаецца на хлусьні й прымусе. Хлусьню я не мог трымаць, і яшчэ з дзяцінства я пачаў разьбіраць дзе праўда, а дзе хлусьня. Цяперашняя ўлада складаецца з былой камуністычнай намэнклятуры, якая выдатна адаптавалася да сучасных умоваў. Замест камуністычнай ідэялёгіі зьявілася ідэялёгія “лукашызму”. Я бачу, што хлусьні ў гэтай улады яшчэ больш, чым у папярэдняй. Мая мэта – гэта паказаць людзям хлусьню цяперашняй улады. Я заўсёды ўмешваюся туды, дзе ёсьць хлусьня й падман і, як паказвае практыка, заўсёды дабіваюся станоўчых вынікаў.

**Наколькі адчуваецца ціск і ў чым ён праяўляецца?**

На мяне спрабуюць націснуць на працы. Але на мяне цісnуць бессэнсоўна. Цісnуць толькі на тых, у каго нявызначаная хісткая пазыцыя. Я змагаюся за правую справу й ведаю, што заўсёды маю рацыю, таму на мяне й націснуць немагчыма. Я добра ведаю свае правы й кожны раз, калі іх парушаюць, я адстойваю іх. Я таксама адстойваю й правы іншых грамадзянаў. Я некалькі разоў балатаваўся ў дэпутаты й нягледзячы на, нібыта, маю паразу грамадзяне пастаянна зьвяртаюцца да мяне як да народнага прадстаўніка, а я ў сваю чаргу ім заўсёды дапамагаю. Хоць улада й прызначыла патрэбных ёй дэпутатаў я свае абяцаньні перад людзьмі стрымліваю. Вырашаць розныя праблемы ў мяне атрымоўваецца добра й ўлада вымушана са мной мірыцца. Калі я працаваў у будаўнічым трэсце №12, то па маёй ініцыятыве была створана першасная арганізацыя Свабоднага прафсаюза. Я быў яе кіраўніком. Неаднаразова мне даводзілася выводзіць людзей на вуліцу. Яны давяралі мне, таму і ішлі за мной. Мы неаднаразова зрываліся з працы й ішлі пешшу да будынка аблвыканкама з патрабаваньнем размовы з губэрнатарам вобласьці. Пазней мяне звольнілі з працы па надуманных прычынах, але судом я быў адноўлены на працу. Другі раз, калі мяне звальнялі з працы, то я пайшоў на міравую й пасьля свайго звальнення адзін за адным я выйграў восемь судоў і адсудзіў сабе ў гэтага прадпрыемства больш за 5 млн. рублёў. Нельга даваць наймальнікам беспакарана выконваць свае жадункі. Мяне звольнілі, але тым самы будаўнічы трэст №12 зрабіў сабе толькі горш. Да мяне працягвалі зьвяртацца людзі, мае былыя калегі, якім я дапамагаў. Сумесна мы падавалі зысхі на вышэйўзгаданы трэст, бо я ведаю, дзе гэтая кантора падманвае людзей. Трэст вымушаны быў павялічыць колькасьць сваіх юрыстаў з аднага да трох, змагаючыся са мной і маімі калегамі.

**З чаго ўсё пачыналася?**

Мне не падабалася з дзяцінства, што старыя дзяцькі дуруць галаву нейкай ідэялёгіяй, а самі не жывуць адпаведна ёй. Калі я працаваў на будоўлі, то я выконваў за дзень некалькі нормаў, але атрымоўваў за сваю працу толькі драбязу. Я пачаў задавацца пытаньнем: “Чаму я так укалываю на будоўле, а не магу ўтрымліваць за заробак сваю сям’ю?” На хвалі дэмакратызацыі пачатку 90-х гг. жыцьцёвы шлях прывёў мяне ў шыхты Свабоднага прафсаюзу Беларускага. Будучы яго сябрам я прайшоў праз рознага роду адукацыйныя сэмінары, у тым ліку юрыдычнай скіраванасьці. Далей я ўступіў у склад новаўтворанага Беларускага Народнага Фронту.

**Гутарку вёў Вітольд Няўрыда**

# Старая апазыцыя" мусіць прызнаць наяўнасьць новага пакаленьня



Ірына Віданава

**Новае пакаленьне лідэраў і актывістаў ініцыявала кампанію "За Свабоду", колькасна дамінавала ў часе дэманстрацыяў і працягвала ладзіць флэш-мобы ды іншыя акцыі пасьля разгону намётавага гарадку ўвесну 2006-га. Чаму большасьць той моладзі сышла ў пасыўнае існаваньне? І як традыцыйная апазыцыя можа дапамагчы новым актывістам знайсьці сваё месца, разважала на міжнароднай канфэрэнцыі, якую ладзіў Беларускі інстытут стратэгічных дасьледваньняў (BISS), галоўны рэдактар адзінага беларускага незалежнага мультымэдыйнага выданьня для моладзі CDMAG Ірына ВІДАНАВА.**

Некаторыя аналітыкі аптымістычна верылі, што новае пакаленьне створыць новыя грамадзкія арганізацыі і дапаможа ажывіць палітычныя партыі. Новыя лідэры -- гэта стварэньне новых арганізацыяў праз самаарганізацыю (намётавы гарадок, флэш-мобы і г.д.), больш высокая, чым у дасьведчаных апазыцыянэраў, хуткасьць прыняцьця рашэньняў плюс арыентацыя на вынік, а не на працэс.

Іншыя пэсымістычна сьцьвярджалі, што татальная ідэалягізацыя і беспрэцэдэнтная хваля рэпрэсіяў прывядуць (ці ўжо прывялі) да фармаваньня апалітычнага і абыякавага пакаленьня малады прыхільнікаў Лукашэнкі.

**Абодва бакі памыляліся.**

З аднаго боку, новае пакаленьне маладзевых актывістаў, якое паўстала пасьля 2001 г., расчаравалася ў "старым" пакаленьні апазыцыйных лідэраў узору 1996 г. Ад апазыцыі чакаліся канкрэтныя дзеяньні і прапановы. Іх не паступала. Відавочна, што ў беларускай апазыцыі назіраецца нават не разрыў, а прорва паміж пакаленьнямі.

У той жа час, не зьявілася і новых моцных маладзевых арганізацыяў (структураў). Большасьць той моладзі, што праявіла актыўнасьць у сакавіку 2006 г., зноў сышла ў пасыўнае існаваньне. Чаму? Адустнасьць досьведу працы ў арганізацыі (арганізацыйныя формы, якія спрацавалі падчас выбараў (абмеркаваньні ў кавярнях і за півам, вельмі нефармальныя стасункі і т.п.), пачалі рассыпацца празь некалькі месяцаў – вакацыі, страта інтарэсу і г.д.), адпаведных ведаў, сеткі падтрымкі (складаныя адносіны паміж неафітамі і традыцыйнай апазыцыяй), адсутнасьць канкрэтных задачаў (практычнай канкрэтыкі) і выніку дзейнасьці.

З другога боку, як паказваюць дадзеныя сацыялягічных дасьледваньняў, асноўнай матывацыяй для маладога пакаленьня не зьяўляюцца чыста эканамічныя выгоды.

Моладзь пераважна прытрымліваецца пра-заходняй, праэўрапейскай арыентацыі. Калі ставіцца пытаньне альбо Расія, альбо Эўропа, то выбар адназначна на карысьць Эўропы, але назіраецца і некаторы ўплыў на сьвядомасьць штампаў, навязаных прапагандай.

Ізаляцыя Беларусі не ўсьведамляецца маладымі людзьмі. Яны па-ранейшаму маюць магчымасьць выязжаць за мяжу. Больш прэтэнзіяў да замежных амбасадаў, чым да рэжыму, які спрыяе самаізаляцыі краіны і такім чынам абмяжоўвае магчымасьці моладзі быць часткай эўрапейскай супольнасьці. Успрыняцьця Беларусі як цёмнай кропкі на мапе Эўропы няма, бо адсутнічае мэнтальнасьць параўнаньня сябе зь іншымі краінамі. Вось чаму настолькі важнай падаецца арыентацыя эўрапейскіх праграмаў на канрэтныя веды, на стварэньне такой мэнтальнасьці, каб Беларусь бачылася ў параўнаньні зь іншымі эўрапейскімі краінамі.

Многія з новых актывістаў далучыліся да старых моладзевых арганізацыяў, такіх як Малады Фронт. Маладафронтаўцы сваімі дзеяньнямі прымусілі сыстэму, калі не адступіць, то здаць назад. І гэта ўжо перамога. Праблема, што пераважная частка моладзі ня ведае пра існаваньне моладзевых арганізацыяў, акрамя БРСМ.

Самая актыўная частка моладзі працягвае супрацьстаяць рэжыму. Пераважная большасьць моладзі (гаворка ідзе пра адукаваную, гарадзкую моладзь) пакуль застаецца пасыўнай, але пры гэтым не зьяўляецца апатычнай. Яна крытычна сочыць за грамадзка-палітычным жыцьцём, у асноўным онлайн.

Моладзевы актывізм і супраціў сёньняшняй рэчаіснасьці выражаецца у розных, часьцей за ўсё непалітычных, формах (шматлікія субкультурныя і артыстычныя тусоўкі, байкеры, экалягічны рух, асьветніцкія групы і т.п.). Зьяўляюцца таксама абсалютна новыя формы актывізму, асабліва гэта датычыцца онлайн актыўнасьці (але Інтэрнэт у асноўным крыніца забаўляльнай і практычнай, а не палітычнай інфармацыі).

Вынікі праведзеных фокус-групаў паказваюць, што маладыя людзі гатовыя да палітычнай актыўнасьці, але яны арыентаваныя на вынік, а таму прагнуць канкрэтных задачаў і дзеяньня.

Вызначэньне і разуменьне моладзевага актывізму павінна быць больш шырокім, чым традыцыйная грамадзка-палітычная дзейнасьць. "Старая апазыцыя" мусіць прызнаць наяўнасьць новага пакаленьня з тым, каб пераадолець існуючы разрыў у пакаленьнях, а таксама дапамагчы новым актывістам знайсьці сваё месца ў дэмакратычнай апазыцыі.

**Магчымыя арэалы супрацоўніцтва з традыцыйнай апазыцыяй:**

**-- Юрыдычная дапамога (як паводзіць сябе пры затрыманьні і т.п.)**
**-- Досьвед правядзеньня масавых акцыяў**
**-- Распаўсюд інфармацыі**
**-- Распаўсюд уласных новых ідэяў моладзі**
**-- Эвалюцыя партыяў (зьмена лідэраў)**
**-- Канкрэтныя грамадзянскія кампаніі (прыклад: Кампанія супраць будаўніцтва АЭС).**

## Работа транспорта в праздничные дни



**В связи с проведением городских новогодних и рождественских праздничных мероприятий движение общественного транспорта будет организовано следующим образом.**

**24 декабря 2007** года с 16:00 до 20:00 и 26 декабря с 10:00 до 17:00 автобусы и троллейбусы будут останавливаться возле ДКиТ «Могилевхимволокно».

**25 декабря 2007** года во время театрализованного шествия Дедов Морозов и Снегурочек: с 11:45 до 13:00 будет перекрыто движение транспортных средств по улице Первомайской от площади Советской до проспекта Мира, по улице Миронова от улицы Первомайской до улицы Пионерской, по бульвару Ленина от проспекта Мира до улицы Миронова, по улице Буденного от улицы Пионерской; движение городского общественного транспорта будет организовано с учетом перекрытия улицы Первомайской;

с 10:00 Советская площадь и прилегающая к ней территория будет освобождена от частного и служебного транспорта для построения участников шествия.

**1 января 2008 года** (в Новогоднюю ночь) с 0:30 до 5:00 движение городского транспорта будет осуществляться по маршрутам:

Троллейбусы
№ 2 «Зеленый луг — завод «Могилевтрансмаш» в количестве 3 единиц;
№ 4 «Любужский лесопарк — железнодорожный переезд» в количестве 3 единиц;
№ 5 «Железнодорожный вокзал — проспект Шмидта — Облгаз» в количестве 3 единиц;
Автобусы
№ 8 «Школа № 13 — улица Симонова — железнодорожный вокзал» в количестве 2 единиц;
№ 4 "Площадь Орджоникидзе — микрорайон Казимировка» в количестве 2 единиц;
№ 45 «Улица Фатина — улица Королева — железнодорожный вокзал» в количестве 2 единиц.

**7 января 2008 года** с 11:00 до 17:00 будет организовано движение автобусов по маршруту № 9-К «Площадь Ленина — Печерский лесопарк» в количестве 4 единиц.

**В период проведения праздничных мероприятий будет обеспечена бесперебойная работа автомобилей индивидуальных перевозчиков.**

## У БРСМе затрымліваюць выплату заробкаў

Андрэй Воўкаў

**- Я баюся застацца на Новы Год бяз грошаў, - распавёў "Нашаму Магілёву" адзін з сакратароў гэтае арганізацыі, - Нам павінны былі выплаціць аванс яшчэ 20-га сьнежня, але грошай дагэтуль няма.**

З крыніц вартых увагі стала вядома, што аванс БРСМ-аўцы атрымаюць разам з асноўнай часткай зарплаты. Адбудзецца гэтае альбо 29-га сьнежня, альбо 5 студзеня. У другім выпадку сябры гэтае арганізацыі сапраўды сустрэнуць сьвята бяз грошай.

Нагадаем, што сёньня стаўка апаратнага БРСМ-аўца складае 480 тысячаў рублёў, а за кожны год стажа дадаецца яшчэ 10 % ад гэтае сумы.

## Сьпяшайцесе скардзіцца

Вітольд Няўрыда

**Суд Ленінскага раёна г. Магілёва не задаволіў скаргу актывістаў Свабоднага прафсаюзу Беларускага Юры Новікава й Сяргея Фаміна на пазапраўныя дзеяньні прадстаўніка адміністрацыі гарвыканкаму спадара Аўсеенкі й адмовіў у правядзеньні пікетаў. Сваё рашэньне судзьдзя Лапаціна матывавала тым, што былі папушчаны неабходныя тэрміны для абскарджваньня рашэньня гарвыканкаму. З рашэньнем суду актывісты СПБ нязгодны.**




Юры Новікаў, намесьнік старшыні СПБ: "Рашэньне судзьдзёй было прынята загадзьдзя. Судзьдзя проста зачытала яго з аркуша паперы. Мы падавалі сваю скаргу ў суд на спадара Аўсеенку, на тое, што ён не зьяўляецца ні старшынёй гарвыканкаму, ні яго намесьнікам. На момант адказу ў нашай заяўцы на правядзеньне пікетаў у падтрымку экс-кандыдата ў прэзыдэнты Аляксандра Казуліна, ён толькі часова выконваў паўнамоцтвы намесьніка адзьдзела па ідэялягічнай працы, а таму не мог прымаць рашэньне аб адмове ў правядзеньні пікетаў".

Другі актывіст СПБ Сяргей Фамін адзначае: "Мы падавалі ў суд на пазапраўныя дзеяньні спадара Аўсеенкі пасьля таго, як атрымалі рашэньне з аблвыканкаму, вышэйстаячай установы, якая прызнала ягоныя дзеяньні пазапраўнымі. Мы гэта зрабілі ў месячны тэрмін з моманту атрыманьня рашэньня аблвыканкаму".

Судзьдзя Лапаціна адзначыла, што падаваць заяўку ў суд неабходна было ў месячны тэрмін з моманту атрыманьня рашэньня ад прадстаўніка гарвыканкаму й не чакаць адпаведнага рашэньня з аблвыканкаму.

Юры Новікаў адзначае, што зараз яны зьбіраюцца абскарджваць сваё рашэньне ў Абласным судзе г. Магілёва. Калі і ў гэтай інстанцыі актывістам адмовяць, то наступная будзе Вярхоўны суд і далей камісія ў ААН па правох чалавека.

Нагадаем, што што пікеты плянаваліся правесьці 1 ліпеня й 30 жніўня гэтага года.

## Беларусь и Россия полностью согласовали топливно-энергетический баланс

Правительства России и Белоруссии полностью согласовали баланс топливно-энергетических ресурсов Союзного государства на 2008 год, сообщил в среду журналистам белорусский премьер-министр Сергей Сидорский по итогам заседания Совета министров Союзного государства в Москве.

"Балансы топливно-энергетических ресурсов Союзного государства на 2008 год согласованы в полном объеме", - сказал он.

Кроме того, премьер Беларуси сообщил, что также согласован важный вопрос, касающийся прогноза баланса спроса и предложения важнейших видов продукции Союзного государства.

"Мы сегодня рассмотрели 16 вопросов. Главное было актуализировать вопросы сотрудничества в торгово-экономической, топливно-энергетической, промышленной и социальной сферах", - сказал он.

Сидорский также отметил, что на заседании было принято решение о реализации в рамках Союзного государства двух новых инновационных программ - по созданию компонентов оптоволоконных систем и по созданию технологий для производства полимерных материалов. "Эти две высокотехнологичные программы дадут основу дальнейшему развитию интеграции в промышленной сфере", - указал он.

# Віншаваньні ад дэмакратаў





**Кристина Шатикова, гражданская активистка**

Хочу поздравить всех с Новым годом. На самом деле, в следующем году жизнь будет гораздо тяжелее и это поможет что-то изменить. К сожалению, чем хуже будет жизнь – тем лучше для нас всех, у людей хоть глаза откроются на происходящее.



**Галина Лисицина, председатель регионального отделения профсоюза РЭП**

"Я хочу, чтобы люди верили в то, что мы будем счастливы в Новом году и наши дети все будут здоровы. Я верю в то, что в Новом году каждому человеку судьба принесёт счастье, радость и любовь: любовь ближних, его личную любовь ко всем. А могилевчанам и соочетественникам, прежде всего, я хочу пожелать здоровья. Будет здоровье – будет возможность творить, созидать и думать."



**Игорь Коваленко, Почётный донор Беларуси, председатель областного оргкомитета Партии свободы и прогресса.**

Желаю могилевчанам здоровья крепкого, чтобы было меньше проблем, чтобы все мы были здоровы, счастливы и веселы в Новом году!



**Владимир Шанцев, председатель областной организации Объединённой гражданской партии (ОГП)**

В первую очередь хочу пожелать могилевчанам, чтобы сбывались все их желания, чтобы было крепкое здоровье, и желаю, наконец, чтобы в следующем году могилевчане на выборах проявили гражданкое мужество и добились, чтобы депутатами Парламента стали те, кого действительно изберут!



**Алесь Агееў, дэпутат Магілёўскага гарадзкога савету, адзіны, хто прытрымлівaецца ў Савеце дэмакратычных поглядаў.**

Хачу павіншаваць магілёўцаў з Новым годам! Жадаю шчасьця, посьпехаў у справах, аптымізму!



**Рыгор Кастусёў, старшыня абласной арганізацыі партыі БНФ**

Жадаю магілёўцам, да і ня толькі магілёўцам – таксама ўсім жыхарам вобласьці паболей аптымізму й каб яны пачалі самі клапаціцца пра сваё жыцьцё – гэта такое незвычайнае віншаваньне. А як звычайна хачу пажадаць здароў'я паболей, паболей грошай і ўсяго самага найлепшага!



**Юрий Новиков, руководитель Могилёвской региональной организации Свободного профсоюза Беларуского**

Хочу пожелать могилевчанам в Новом году крепкого здоровья, удачи в личной жизни, успехов в работе, быть более мужественными и настойчивыми в отстаивании своих прав.

# Якім будзе 2008-ы?

**Ад рэдакцыі**

**Разам з дэмакратычнымі лідэрамі магілёўшчыны мы спрабавалі паразважаць пра тое, што чакае нас у Новым годзе.**

Большасьць прагнозаў не выглядае аптымістычна. Як адзін з аргумэнтаў нясьветлае будучыні, Рыгор Кастусёў адзначыў, што па Беларусі панізілась сярэдняя зарабатная плата. Толькі Уладзімер Шанцаў сказаў, што, нажаль, у 2008-ым нічога ня зьменіцца:

«Сур'ёзных зрухаў ня будзе. Нажаль, сёньня ўсё настолькі «схоплена ўладай і настолькі павязана з Расеяй, што можна ўпэўнена казаць, што сур'сёных зрухаў і зменаў ня будзе. Калі ўлічыць атрыманый ад Расеі крэдыт у 1,5 млрд даляраў, эканамічных зрухаў таксама ня будзе».

Але, калі зьвярнуцца да досьведу суседніх краінаў, цалкам верагодна, што гэты крэдыт не паўплывае на эканоміку Беларусі з тое прычыны, што атрыманыя грошы верхавіна ўлады папросту расьпіхае па кішэнях, і ані эканоміка, ані людзі, плёну зь іх не пабачаць. Падчас палітычнае смуты, калі супраць рэжыму ўведзены эканамічныя санкцыі, рахункі «Белнафтахіму» замарожаныя ня толькі ў ЗША, але ўжо й на Украіне, самым лягічным для кіруючай эліты выглядае варыянт «нахапаць як мага болей і змыцца». Гэтаму спрыяе яшчэ і ўзровень карупцыі, адзін з самых высокіх у сьвеце.

Што датычыцца стабільнасьці, тут вельмі трапна адзначыла Крысьціна Шацікава: «Стабільнасьці ня будзе. Тыя законапраекты, якія прынятыя на 2008-ы год ужо дыстабілізуюць сытуацыю ў краіне. І гэта датычыцца ня толькі прадпрымальнікаў, якіх фактычна вынішчаюць, і ня толькі адмены ільготаў.»

Не губляе надзеі на нашае кіраўніцтва толькі Галіна Лісіцына: «Я вельмі маленькі чалавек, каб рабіць прагнозы, але я хацела б, каб нашае добрае і паважане кіраўніцтва, - напішыце менавіта гэтак: добрае і паважанае, - дапамагло тым людзям, якія пацярпелі ад Закона пра адмену ільготаў, хоць чымсьці дапамогло кожнай гэтакай катэгорыі грамадзянаў, каб яны не адчулі гэтае згубы, хоць бы якнебудзь кампэнсавалі адмену ільготаў». Вашыя словы б - ды Бацьке ў вушы, Галіна Міхайлаўна!

Фактычна адмовіўся прагназаваць палітычныя падзеі 2008-га дэпутат Градскога Савету Аляксандар Агееў. Ён сказаў толькі, што кошты зьменяцца ў неспрыяльны бок і, хутчэй усяго, ў гэтым годзе будзе дабудаваная Ратуша, таму што Лукашэнка заклаў туды капсулу.

Найбольшы аптымізм выявіў Ігар Каваленка, Ганаровы донар Беларусі. Ён лічыць, што гэты год павінен карэнным чынам зьмяніць Беларусь, менавіта ў 2008-мым пачнецца новы віток будаўніцтва грамадзянскай супольнасьці.

Так ці інакш, цалкам верагодна, што ранкам 1 студзеня мы прачнемся ў новай краіне. Ужо няма таго пачуцьця застрахаванасьці і стабільнасьці. Падзеі мінулага году паказалі, што не ўсё добра ў нашай эканоміцы, пачалі зрастаць кошты на ежу, камунальныя паслугі. Будзем спадзявацца, што Божанька любіць Беларусь і нас міне як зацяглы застой у жыцьці грамадзтва, гэтак і крыза ад раптоўных пераменаў.

## Павіньшуй палітвязьняў з Новым годам!

**Так сталася, што на пачатку XXІ-га стагодзьдзя ў сьвеце яшчэ ёсьць краіны, дзе людзей перасьледваюць па палітычных прыкметах.**

У гэты сьпіс патрапіла й Беларусь. На сучасны момант у Беларусі за палітычную дзейнасьць за кратамі ўтрымліваецца пяць чалавек: гэта экс-кандыдат у прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь прафэсар Аляксандар Казулін, былы дэпутата Вярхоўнага Савету Андрэй Клімаў, лідары незарэгістраванай арганізацыі "Малады Фронт" Зьміцер Дашкевіч і Артур Фінькевіч, прадпрымальнік Мікола Аўтухвіч.

**Зрабіце прыемнае гэтым людзям. Падтрымайце іх у цяжкую хвіліну.**

**Творчая група "НАШ Магілёў" гэта ўжо зрабіла, а вы?**

**Казулін Аляксандар**
Віцебскі раён, пас. Віцьба, ВК-3, атрад 1
211300 Віцебская вобласьць

**Клімаў Андрэй**
г. Мазыр-11, ВК-20
247760 Гомельская вобл.

**Дашкевіч Зьміцер**
Шклоў, ВК №17
213004 Магілёўская вобласьць

**Артур Фінькевіч**
г. Магілёў, 212011
вул Крупскай дом 99а
(сьледчая турма №4),
камэра 85

**Аўтуховіч Мікола**
Менск, вул. Кальварыйская 36,
ВК-1, а/с 35, атрад 3

**Вітаем усіх прыхільнікаў Аляксандра Лукашэнкі, калі такія ёсьць, з Новым годам!**

**Рэдакцыя газэты "НАШ Магілёў" шукае прыхільнікаў курсу дзеючай улады, для адкрыцьця новае рубрыкі "Чаму я ЗА!".**
**Калі ласка, зьвярніцеся да нас:**
**Магілёў, 212017, а\с 46**

**За четыре месяца в редакцию не обратился ни один сторонник А. ЛУКАШЕНКО!**

# НАШ Магілёў

www.nmahileu.org

# 2008

**Сьвяточныя й памятныя даты**

**7 студзеня** - Праваслаўнае Раство

**28 студзеня** - Дзень атрыманьня Магілёвам магдэбурскана права

**14 лютага** - Дзень Сьвятога Валянціна

**15 сакавіка** - Дзень Канстытуцыі

**25 сакавіка** - Дзень Волі

**26 красавіка** - Дзень Чарнобыльскай катастрофы

**1 траўня** - Дзень Працы

**3 ліпеня** - Дзень вызваленьня Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

**27 ліпеня** - Дзень Незалежнасьці

**1 нядзеля верасьня** - Дзень беларускай пісьменнасьці

**8 верасьня** - Дзень беларускай вайсковай славы

**19 верасьня** - Дзень нацыянальнага сьцяга й герба

**10 сьнежня** - Сусьветны дзень абароны правоў чалавека

**25 сьнежня** - Каталіцкае Раство



## Студзень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| **7** | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 |
| **28** | 29 | 30 | 31 | | | |

## Люты

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | **14** | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | | |

## Сакавік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | **15** | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | **25** | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |
| 31 | | | | | | |

## Красавік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | **26** | 27 |
| 28 | 29 | 30 | | | | |

## Травень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | **1** | 2 | 3 | 4 |
| 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 |
| 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 |
| 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 |
| 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | |

## Чэрвень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | 1 |
| 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 |
| 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 |
| 30 | | | | | | |

## Ліпень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 |
| 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 |
| 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | **27** |
| 28 | 29 | 30 | 31 | | | |

## Жнівень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | 1 | 2 | 3 |
| 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 | 24 |
| 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 | 31 |

## Верасень

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | **7** |
| **8** | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | | | | | |

## Кастрычнік

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
| 13 | 14 | 15 | 16 | 17 | 18 | 19 |
| 20 | 21 | 22 | 23 | 24 | 25 | 26 |
| 27 | 28 | 29 | 30 | 31 | | |

## Лістапад

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1 | 2 |
| 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
| 17 | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 | 23 |
| 24 | 25 | 26 | 27 | 28 | 29 | 30 |

## Сьнежань

| Пн | Аў | Ср | Чц | Пт | Сб | Нд |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 8 | 9 | **10** | 11 | 12 | 13 | 14 |
| 15 | 16 | 17 | 18 | 19 | 20 | 21 |
| 22 | 23 | 24 | **25** | 26 | 27 | 28 |
| 29 | 30 | 31 | | | | |

НАШ Магілёў

**Незалежнае грамадзка - палітычнае выданьне Горада**

Выдавец Андрусь Воўкаў, дырэктар Вітольд Няўрыда, карэктар Лех Баліцкі.

Надрукавана на ксэраксе ў горадзе Магілёве. Наклад: 299 ас.

**Кантакт: Магілёў, 212017, а/с 46**

**gazetanm@yandex.ru**

Тыражаваньне й распаўсюд усімі зацікаўленымі асобамі дазваляецца й вітаецца. Распаўсюд бясплатны.

Творчая група НАШ Магілёў